# ГІСТОРЫЯ

УДК 94(47+57)«1941/45»+930(476)

***У.В. Здановіч***
*канд. гіст. навук, дац., заг. каф. гісторыі Беларусі*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна*
e-mail: ZVV2003@tut.by

## БАЯВЫЯ ДЗЕЯННІ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ ЛЕТАМ 1941 г.: АСВЯТЛЕННЕ ПРАБЛЕМЫ Ў ДАКУМЕНТАЛЬНЫХ ЗБОРНІКАХ (2010–2016 гг.)

*Аналізуюцца выдадзеныя ў 2010–2016 гг. дакументальныя зборнікі, прысвечаныя баявым дзеянням на тэрыторыі Беларусі летам 1941 г. Адзначаецца, што складальнікамі зборнікаў была праведзена значная праца па пошуку і падрыхтоўцы да друку разнастайных крыніц, выяўленых у асноўным у замежных архівах. Дакументальныя зборнікі, якія з’явіліся ў адзначаны перыяд, у пераважнай большасці мелі тэматычны характар. Адной з асаблівасцей дадзенага перыяду стала падрыхтоўка дакументальных зборнікаў сумеснымі намаганнямі беларускіх і замежных гісторыкаў. У цэлым паспяхова былі вырашаны пытанні перадачы тэксту і археаграфічнага афармлення дакументаў. Істотным дапаўненнем зместу апублікаваных дакументаў з’яўляецца навукова-даведачны апарат. Разам з тым дадзеная праблема не можа быць канчаткова вырашана без абнаўлення крыніцавай базы па гісторыі мінулай вайны, увядзення ў навуковы ўжытак усяго комплексу дакументаў.*

### Уводзіны

Адным з паказчыкаў вывучанасці праблемы, які характарызуе стан спраў на кожным этапе крыніцазнаўчай базы даследавання тэмы, з’яўляецца ўзровень публікацыі дакументальных крыніц. Дакументы і матэрыялы, апублікаваныя ў розных зборніках і перыядычным друку, займаюць важнае месца сярод гістарыяграфічных крыніц. Яны даюць магчымасць вызначыць канцэпцыі публікатараў, накіраванасць і ўзровень даследавання тэмы ў розныя перыяды. На працягу 2010–2016 гг. былі дасягнуты значныя поспехі ў пашырэнні крыніцазнаўчай базы, прысвечанай асвятленню баячвых дзеянняў летам 1941 г. на тэрыторыі Беларусі. У навуковы ўжытак была ўведзена значная колькасць разнастайных дакументаў, што з’яўляецца несумненнай заслугай айчынных даследчыкаў. Складальнікамі зборнікаў была праведзена сур’ёзная праца па пошуку і падрыхтоўцы да друку разнастайных крыніц, выяўленых у асноўным у замежных архівах, у першую чаргу нямецкіх. Павелічэнне колькасці выдадзеных дакументальных зборнікаў суправаджалася павышэннем ўзроўню іх археаграфічнай апрацоўкі.

У шэрагу прац па гістарыяграфіі дадзенай тэмы адлюстраваны некаторыя пытанні дакументальнага вывучэння гісторыі Беларусі пачатковага перыяду вайны [1–4]. Аднак у выдадзеных працах комплексна не характарызуюцца выданні, якія ўбачылі свет у 2010–2016 гг. Мэтай артыкула з’яўляецца аналіз гістарыяграфічных крыніц, якія ўбачылі свет пасля 2010 г.

### Характарыстыка дакументальных зборнікаў

Выдадзеныя дакументальныя крыніцы ўмоўна можна падзяліць на дзве групы. Да першай адносяцца зборнікі дакументаў. У 2016 г. сумеснымі намаганнямі беларускіх гісторыкаў Я.С. Разенблата, І.Э. Яленскай, А.І. Пашковіч, С.У. Струнца і дактаранта Лейпцыгскага ўніверсітэта К. Ганцэра (кіраўнік аўтарскага калектыву) падрыхтаваны зборнік «Брест. Лето 1941 года. Документы. Материалы. Фотографии», у якім на падставе сведчанняў савецкага (абаронцы Брэсцкай крэпасці, члены іх сямей, жыхары Брэста, эвакуяваныя партыйныя работнікі, вышэйшае савецкае ваеннае кіраўніцтва) і нямецкага (ваеннаслужачыя вермахта, паліцэйскія) бакоў паказана сітуацыя, якая склалася ў Брэсце і крэпасці ў першыя тыдні вайны [5]. Выяўленыя ў архівах і музеях Аўстрыі, Беларусі, Германіі, Ізраіля, Польшчы, Расіі дакументы, пераважная большасць

якіх упершыню ўводзіцца ў навуковы ўжытак, налічваюць 188 адзінак і тэматычна ўключаны ў тры раздзелы: баявыя дзеянні (дакументы 1–125), сітуацыя ў горадзе (дакументы 126–162), пачатак тэрору (дакументы 163–188).

Асноўную частку першага раздзела складаюць нямецкія крыніцы (105 дакументаў): дакументы вермахта, эга-дакументы. Пісьмовыя крыніцы вермахта ўмоўна можна падзяліць на дзве падгрупы. Да першай (большай) адносяцца данясенні, загады, якія ствараліся для забеспячэння функцыявання паўсядзённага жыцця войска. Журналы баявых дзеянняў, справаздачы аб баявых дзеяннях розных падраздзяленняў (другая падгрупа) складаліся, як правіла, пасля падзей з перспектывай іх вывучэння ў далейшым, што выклікае цяжкасці з вызначэннем канкрэтнага часу з'яўлення пэўнага запісу.

Эга-дакументы прадстаўлены фрагментамі пяці дзённікаў (двух салдат і трох афіцэраў), а таксама лістамі нямецкіх салдат і афіцэраў.

«Публікуемыя матэрыялы, – адзначаюць аўтары зборніка, – за некаторым выключэннем, ахопліваюць першы месяц ваенных дзеянняў, з моманту нападзення да 18 ліпеня 1941 г., калі горад Брэст і крэпасць ў ваенных адносінах былі перададзены ў падпарадкаванне камандуючаму войскамі ў Генерал-губернатарстве. Акрамя таго, пэўнай знакавай мяжой з'яўляецца дата 23 ліпеня 1941 г. – палон маёра Пятра Гаўрылава, які лічыцца апошнім абаронцам Брэсцкай крэпасці» [5, с. 8].

Асобны від змешчаных у зборніку дакументаў – фотаздымкі, аўтарам большасці з якіх з'яўляецца былы ваеннаслужачы 45-й нямецкай пяхотнай дывізіі Хайнц Мозер. Важкім дапаўненнем альбома Х. Мозера стала калекцыя былога ваеннаслужачага 45-й нямецкай дывізіі Міхаэля Вехтлера, якая захоўваецца ў Дзяржаўным архіве Аўстрыі.

Пераважная частка нямецкіх дакументаў звязана з разнастайнай справаздачнай дакументацыяй 45-й пяхотнай дывізіі і яе структурных падраздзяленняў, якія штурмавалі крэпасць. Своеасаблівым падвядзеннем вынікаў баёў за крэпасць з'яўляецца змешчаная пад № 101 «Справаздача камандзіра 45-й пяхотнай дывізіі генерал-маёра Ф. Шліпера аб баявых дзеяннях па захопу Брэст-Літоўска генеральнаму штабу сухапутных войск», датаваная 8 ліпеня 1941 г. Неабходна адзначыць, што гэты дакумент ужо вядомы даследчыкам. Раней ён быў апублікаваны ў гісторыка-дакументальнай хроніцы г. Брэста «Памяць» расійскім даследчыкам Р. Аліевым, беларускім гісторыкам С.Я. Новікавым [6–8]. Дарэчы, Р. Аліеў, хаця і ў скарочаным выглядзе, апублікаваў журнал баявых дзеянняў 45-й дывізіі, а таксама некаторыя іншыя нямецкія дакументы, змешчаныя ў выдадзеным у 2010 г. у Маскве зборніку «Брестская крепость. Воспоминания и документы» [6]. 146 малавядомых нямецкіх дакументаў і ўспамінаў напасрэдных абаронцаў крэпасці ўключаны Р. Аліевым у асобны раздзел «Брестская крепость в документах вермахта и воспоминаниях ее защитников и штурмующих (февраль – август 1941 г.)».

Зборнік [6] выклікаў неадназначную рэакцыю, аб чым сведчаць дзве супрацьлеглыя рэцэнзіі. Так, беларускі гісторык С.Я. Новікаў, нягледзячы на асобныя нязначныя заўвагі, звязаныя ў асноўным са зробленымі да дакументаў каментарыямі і даведкамі, у цэлым станоўча ацэньвае выданне, адзначыўшы, што «аналіз новай камбінаванай працы дае падставы для высокай ацэнкі зробленага калектыўнымі намаганнямі зборніка дакументаў і ўспамінаў… Уведеныя ў навуковы ўжытак новыя матэрыялы кардынальна мяняюць асобныя палажэнні, усталяваныя ў беларускай гістарыяграфіі аб абароне Брэсцкай крэпасці» [9, с. 33].

Іншую ацэнку працы Р. Аліева дае кіраўнік аўтарскага калектыву зборніка «Брест. Лето 1941 года. Документы. Материалы. Фотографии» К. Ганцэр у артыкуле «Спекуляцыі замест сур'ёзнага даследавання», апублікаваным у часопісе «Архе» [2]. У высновах К. Ганцэр піша: «Крыніцы выбраны паводле прынцыпу выпадковасці (тое, што напісана ад рукі, Р. Аліеў не публікуе). Яны былі транскрыбіраваны непрафесійна (відавочна, часткова з дапамогай праграмы для распазнання тэксту), таму ў іх ёсць памылкі. Яны былі не досыць добра перакладзены, ці, адпаведна, пераклады былі недастаткова правераныя. Даюцца шчодрыя і каментары, і спекуляцыі ў дачыненні да друга-

радных дэталей, у той час як чытач пазбаўлены важнай інфармацыі пра характар крыніц. Крытыка крыніц адсутнічае амаль поўнасцю, як і ўказанні крыніц у каментары. Праца такога кшталту, без публікацыі паказальніка асоб і населеных пунктаў, сведчыць пра выключны непрафесіяналізм» [2, с. 172]. Рэцэнзент дадае: «Р. Аліеў піша не як прафесійны гісторык, а як аматар. Свае сцвярджэнні ён не падмацоўвае доказамі, а чытач іх праверыць не можа» [2, с. 165]. На наш погляд, заўвагі, зробленыя нямецкім даследчыкам, з'яўляюцца абгрунтаванымі і зніжаюць навуковую значнасць працы Р. Аліева.

Савецкія крыніцы, якія налічваюць 17 адзінак, прадстаўлены ў зборніку «Брест. Лето 1941 года. Документы. Материалы. Фотографии» дакументамі камандавання 4-й арміі і яе падраздзяленняў, дакладнымі запіскамі партыйных кіраўнікоў Брэсцкага абкама КП(б)Б у ЦК УКП(б) і ЦК КП(б)Б, успамінамі абаронцаў Брэсцкай крэпасці і жыхароў горада, выяўленымі ў фондах матэрыялаў Камісіі па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, вытрымкамі з пратакола закрытага судовага пасяджэння Ваеннай калегіі Вярхоўнага суда СССР па справе Д.Р. Паўлава, В.Я. Клімаўскіх, А.Ц. Грыгор'ева і А.А. Карабкова, загадам № 1 аб арганізацы абароны Брэсцкай крэпасці. Асаблівую цікавасць выклікаюць надпісы на сценах крэпасці. Усяго вядома 12 надпісаў, якія былі знойдзены ў 1949, 1951, 1952, 1958 гг. На жаль, з 12 знойдзеных надпісаў захавалася ўсяго 5 арыгіналаў. Пераважная большасць савецкіх дакументаў была апублікавана раней. Новымі з'яўляюцца ўспаміны абаронцаў Брэсцкай крэпасці, выяўленыя беларускімі аўтарамі зборніка ў фондах Камісіі па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Акадэміі навук СССР. Звяртаюць на сябе ўвагу запісаныя 14 снежня 1944 г. успаміны С. Матэвасяна, змешчаныя на 7 старонках (дакумент 123). У кнізе С.С. Смірнова «Брестская крепость», выдадзенай у 1954 г., успаміны змясціліся ўжо на 2,5 старонках. Дадзены факт яшчэ раз даказвае, што падрыхтоўка і выданне мемуарнай літаратуры мелі шэраг асаблівасцяў і ў значнай ступені залежалі ад грамадска-палітычнай сітуацыі ў краіне. Выданне ўспамінаў было пастаўлена пад кантроль. Па сутнасці, усе яны пісаліся па адной схеме і толькі з неабходным станоўчым зместам. Ва ўсіх мемуарах адчуваецца пэўная недасказанасць у паказе цяжкасцяў і негатыўных момантаў.

Нязначную групу (3 адзінкі) складаюць дакументы польскага падполля.

З прадстаўленых у першым раздзеле «Боевые действия» дакументаў вынікае, што мужнасць і гераізм абаронцаў сарвалі распрацаваны нямецкі план нанясення ўдару па крэпасці і не далі магчымасці 45-й дывізіі выканаць задачу па захопу цытадэлі ў вызначаныя тэрміны.

Прыведзеныя ў зборніку дакументы пададзены на дзвюх мовах (на мове арыгінала і ў перакладзе), што з'яўляецца несумненнай заслугай аўтараў зборніка і дазваляе даследчыкам пазнаёміцца з арыгінальнымі нямецкімі дакументамі. Важны складнік зборніка – падрыхтаваны аўтарамі навукова-даведачны апарат, які ўключае прадмову, імянны паказальнік, паказальнік населеных пунктаў, спіс скарачэнняў, пералік выкарыстаных крыніц, бібліяграфію. Высокай ацэнкі заслугоўваюць 763 навуковыя каментары, у аснову якіх пакладзены навуковы прынцып выкарыстання крыніц.

Размешчаныя ў храналагічным парадку (у асноўным па часе падзей) дакументы ўтрымліваюць рэдакцыйны загаловак, у якім указваецца яго разнавіднасць, аўтар, адрасат, кароткі змест і дата напісання. Кожны дакумент мае легенду, якая змешчана пад тэкстам дакумента і ўключае пошукавыя дадзеныя дакумента (назву архіва, нумары фонду, справы і аркушаў на нямецкай мове).

У цэлым станоўча ацэньваючы дадзены зборнік, неабходна адзначыць і некаторыя недахопы. На недакладнасці, звязаныя з перакладам асобных ваенна-гістарычных тэрмінаў, назваў, прыведзеных у тэксце дэфініцый, факталагічнымі аспектамі зместу матэрыялаў зборніка, звярнуў увагу ў сваёй рэцэнзіі С.Я. Новікаў [3]. На наш погляд, больш пытанняў выклікаюць два артыкулы нямецкіх даследчыкаў і адсутнасць артыкулаў айчынных гісторыкаў. Асаблівую ўвагу звернем на артыкул К. Ганцэра. Выклікае пярэчанне ўжо сама яго назва «Сталина длинная тень. Плен как ключевая проблема ис-

ториографии обороны Брестской крепости», якая больш падыходзіць да папулярнага, публіцыстычнага, а не навукова-дакументальнага выдання, якім і з’яўлецца дадзены зборнік. Сканцэнтраваўшыся на праблеме палону, аўтар пакінуў па-за ўвагай гераізм і мужнасць абаронцаў, якія сарвалі план захопу крэпасці ў вызначаны вермахтам тэрмін. Мэтазгодна было б даць агульны артыкул аб баявых дзеяннях у горадзе і крэпасці, складнікам якога магла быць і разгледжаная К. Ганцэрам праблема. Дадатковага тлумачэння, як мінімум, патрабуе і назва аднаго з падраздзела «Защитники Брестской крепости – из предателей в герои». Непрымальнай з’яўляецца і заключная частка, у якой К. Ганцэр, па сутнасці, «вучыць» нас, як неабходна адносіцца да гераізму і патрыятызму: «Ці разумна гэта – прадстаўляць падрастаючым пакаленням самазабойства як выбар сапраўднага патрыёта. Хіба патрэбна выстаўляць у гераічным свеце сітуацыю, калі хтосьці добраахвотна ідзе на смерць перад вачыма сваёй жонкі і дзяцей» [5, с. 40]. Нагул, ацэнкі, выказаныя К. Ганцэрам, гучаць даволі катэгарычна, што выклікае недавер.

Аднак галоўнай часткай зборніка з’яўляюцца не артыкулы, а змешчаныя ў ім дакументы, якія дазвалюць удакладніць некаторыя моманты абароны Брэсцкай крэпасці, раскрыць сітуацыю ў горадзе ў першыя тыдні вайны, пазнаёміць з асобнымі фактамі знішчэння насельніцтва ў ліпені 1941 г. І ў гэтым сэнсе значэнне дадзенага выдання цяжка пераацаніць. Нягледзячы на наяўнасць у прадстаўленых дакументах няпоўнай і нават памылковай інфармацыі, яны дазваляюць удакладніць храналогію падзей першых дзён вайны ў Брэсце і крэпасці.

У другую групу дакументальных крыніц уваходзяць дакументы і матэрыялы, уключаныя ў склад манаграфічных выданняў. Напярэдадні 70-годдзя Вялікай Перамогі ўбачыла свет манаграфія С.Я. Новікава «Беларусь улетку 1941 года: новыя падыходы ў даследаванні баявых дзеянняў» [7]. У другім раздзеле кнігі змешчаны 57 новых перакладзеных з нямецкай мовы крыніц: дакументы палявых часцей сухапутных сіл вермахта (№ 1–33); танкавых дывізій 2-й і 3-й танкавых груп (№ 34–37); нямецкай кавалерыі (№ 38–41); камандуючага тылам групы армій «Цэнтр» (№ 42–51); пратаколы допытаў савецкіх ваеннапалонных (№ 52–54); успаміны нямецкіх удзельнікаў вайны (№ 55–57).

Кожны з дакументаў: загад армейскага камандавання аб наступленні, данясенне камандавання корпусам аб ходзе выканання баявых заданняў, вытрымка з журнала баявых дзеянняў, аператыўная зводка аб становішчы праціўніка і г.д. – быў для аўтара працы тым фактаграфічным падмуркам, на аснове якога гісторык імкнуўся ў меру магчымасцей разабрацца, якой была гістарычная рэальнасць на кожным з участкаў абароны Заходняга і Цэнтральнага франтоў у Беларусі летам 1941 г.

Разам з дакументамі і матэрыяламі важнае месца ў кнізе займаюць дадаткі: «Карта акругі Беласток», «Карта Рэйхскамісарыята Остланд», «Карта Рэйхскамісарыята Украіна» (№ 1–10), «Баявыя схемы» (№ 11–17), «Факсіміле дакументаў» (№ 18–21), «Табліцы» (№ 22–23).

У цэлым пытанні перадачы тэксту і археаграфічнага афармлення дакументаў вырашаны. Аднак аўтару не ўдалося пазбегнуць пэўных недахопаў. Так, на старонках, дзе прыведзена вялікая колькасць геаграфічных назваў, адсутнічае геаграфічны паказальнік па тэрыторыі Беларусі. Значна б павысіў каштоўнасць манаграфіі і імянны паказальнік.

Адзначаныя заўвагі ў большасці сваёй былі выпраўлены аўтарам у другім, дапоўненым і перапрацаваным, выданні, якое выйшла ў 2015 г. у Смаленску. Адметнай рысай новай манаграфіі С.Я. Новікава стала павелічэнне колькасці ўведзеных у навуковы ўжытак нямецкіх дакументаў, якія прадстаўлены загадамі, рапартамі і тэлеграмамі аператыўных службаў вярхоўнага галоўнакамандавання вермахта (дакументы 1–4), галоўнага камандавання сухапутных войскаў (дакументы 5–7), дакументамі камандавання групы армій «Цэнтр» (дакументы 8–22, 60–62, 64, 71–75), а таксама загадамі, данясеннямі, дзённікамі баявых дзеянняў нямецкіх баявых падраздзяленняў, якія штурмавалі баявыя рубяжы Чырвонай Арміі (дакументы 23–28, 30, 33, 34, 36, 39–41, 43–47, 50, 52, 54, 63, 65–70). Дапаўняюць гэтыя крыніцы матэрыялы нямецкіх допытаў савецкіх ва-

енапалонных (дакументы 76–78), успаміны ўдзельнікаў вайны (дакументы 79–81) [10]. У дадатках з 7 да 11 была павялічана колькасць баявых схем.

Да гэтай групы адносіцца і другая кніга (зборнік дакументаў) – сумеснае выданне беларускіх, расійскіх і ўкраінскіх навукоўцаў двухтомніка «1941 год: Страна в огне», куды ўключаны дакументы, якія адлюстроўваюць ход ваенных дзеянняў на франтах Вялікай Айчыннай вайны ў 1941 г. і арганізацыю ўсенароднага адпору захопнікам [11]. Зборнік (налічвае 383 дакументы) падзелены на тры часткі, прысвечаныя Расіі (134 крыніцы), Беларусі (127 крыніц) і Украіне (122 крыніцы). Беларуская частка падрыхтавана А.А Каваленем, А.М. Літвіным, У.І. Кузьменкам і І.Ю. Варанковай і ўключае пастановы СНК і ЦК КП(б)Б, дырэктывы Чырвонай Арміі, распараджэнні, дакладныя запіскі, лісты Ваеннага савета Заходняй асобай ваеннай акругі, загады, спецпаведамленні, радыё- і аператыўныя зводкі, данясенні, перамовы, дадаткі да дзённікаў баявых дзеянняў нямецкіх фарміраваняў і інш. Са 127 дакументаў, выяўленых у Расійскім дзяржаўным ваенным архіве, Цэнтральным архіве Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі, Дзяржаўным архіве Расійскай Федэрацыі, Расійскім дзяржаўным архіве сацыяльна-палітычнай гісторыі, Федэральным ваенным архіве Германіі ў Фрайбургу, Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь, 67 упершыню ўводзяцца ў навуковы ўжытак.

Новыя архіўныя крыніцы, пададзеныя ў вышэйадзначаных выданнях, дазваляюць па-іншаму паглядзець на некаторыя колькасныя паказчыкі баявых дзеянняў на тэрыторыі Беларусі летам 1941 г. У першую чаргу, гэта тычыцца страт праціўніка і Чырвонай Арміі. Так, згодна дадзеных айчыннай гістарыяграфіі, атрыманых з савецкіх крыніц, пры штурме г. Магілёва загінула 30 тыс. нямецкіх салдат і афіцэраў [12, с. 101]. Магілёўскі гісторык М.С. Барысенка, які доўгі час вывучае гісторыю абароны г. Магілёва, у кнізе «Днепровский рубеж: трагическое лето 1941-го» на падставе знойдзеных у лясах Магілёўскай вобласці штабных дакументаў 20-га механізаванага корпуса Чырвонай Арміі, а таксама матэрыялаў Цэнтральнага архіва Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі даводзіць, што немцы страцілі пад Магілёвам 17 тыс. чалавек [13, с. 253]. С.Я. Новікаў, выкарыстоўваючы дзённікі баявых дзеянняў чатырох нямецкіх дывізій, якія штурмавалі Магілёў, сцвярджае, што іх агульныя страты склалі 3 765 афіцэраў, унтэр-афіцэраў і радавых [10, с. 80].

Значныя разыходжанні назіраюцца і пры вызначэнні вынікаў баёў для абаронцаў Магілёва. Паводле падлікаў М.С. Барысенкі, зробленых на падставе савецкіх крыніц, у горадзе загінула 15 тыс. савецкіх воінаў без уліку народных апалчэнцаў. Колькасць палонных засталіся па-за яго падлікамі. С.Я. Новікаў на аснове дзённіка баявых дзеянняў 7-й, 15-й, 23-й і 78-й нямецкіх пяхотных дывізій, данясенняў і рапартаў камандавання 7-га пяхотнага корпуса, а таксама аператыўных матэрыялаў камандавання 2-й палявой арміі вермахта сцвярджае, што на працягу аднаго тыдня (з 20 па 26 ліпеня 1941 г.) у нямецкі палон трапілі 35 031 чалавек, у тым ліку 31 афіцэр Чырвонай Арміі [10, с. 75].

Не адмаўляючы навуковай каштоўнасці уведзеных у навуковы ўжытак новых дакументаў, падкрэслім, што яны не з'яўляюцца абсалютна дакладнымі і патрабуюць верыфікацыі. У поўнай меры гэтая заўвага мае дачыненне і ў адносінах да нямецкіх крыніц. Для доказу звернемся да лічбавых паказчыкаў аб выніках Гомельскай аперацыі. Так, згодна з паведамленнем камандавання 2-й палявой арміі, агульныя страты з нямецкага боку ў ходзе тыднёвых баявых дзеянняў на гомельска-крычаўскім напрамку склалі 5 190 чалавек, з якіх 1 468 чалавек забітымі, 3 367 параненымі, 355 чалавек зніклі без вестак. А паводле падлікаў, зробленых С.Я. Новікавым, «пасля завяршэння пяцідзённай «бітвы пяхоты на ўсходзе» агульная колькасць нямецкіх страт 2-й палявой нямецкай арміі складала 31 757 чалавек, пры гэтым з іх забітымі і зніклымі без вестак былі 10 057, прычым больш за палову іх у баях за Гомель» [10, с. 95–96].

Яшчэ адным доказам суб'ектыўнасці і недакладнасці нямецкай статыстыкі з'яўляюцца звесткі аб колькасці чырвонаармейцаў, якія трапілі ў палон пры абароне Брэсцкай крэпасці. Згодна з данясеннем Ф. Шліпера, да канца чэрвеня 1941 г. трапілі ў палон

101 афіцэр і 7 122 малодшых камандзіраў і радавых абаронцаў горада і крэпасці [5, с. 306]. Аналіз данясення дае зусім іншую лічбу: 2 739 чырвонаармейцаў (без жанчын і дзяцей) (23.06 –1 900 чалавек; 26.06 – 450 чалавек; 29.06 – 389 чалавек) [5, с. 302, 304, 305]. Маёр К.Х. Верзінг у данясенні ва ўпраўленне тылу АОК 4 аб трафеях, захопленых у Брэст-Літоўску, павялічвае лічбу на 1 250 салдат і афіцэраў, якія трапілі ў палон 24 чэрвеня 1941 г. Адначасова ён адзначае, што 28 чэрвеня на тэрыторыі крэпасці немцамі выяўлены амаль 2 000 «забітых рускіх» [6, с. 371]. Начальнік штаба групы 4-й арміі Грэйфенберг у данясенні Аператыўнаму аддзелу Генеральнага штаба Сухапутных сіл Галоўнага камандавання Сухапутных сіл Германіі паведамляе, што «ў адной толькі Цытадэлі было ўзята ў палон каля 6 000 чалавек» [5, с. 185].

Кіраўнік аўтарскага калектыву зборніка «Брест. Лето 1941 года. Документы. Материалы. Фотографии» К. Ганцэр у рэдакцыйным артыкуле «Сталина длинная тень. Плен как ключевая проблема историографии обороны Брестской крепости» піша: «На самой справе ў перыяд з 22 па 30 чэрвеня каля 6 800 абаронцаў крэпасці трапілі ў палон – гэта прыблізна 75% ваеннаслужачых Чырвонай Арміі, якія 22 чэрвеня 1941 г. знаходзіліся ў крэпасці. Гэтыя лічбы заснаваны не толькі на дадзеных “Справаздачы аб баявых дзеяннях па захопу Брэст-Літоўска” генерала Ф. Шліпера, але і на звестках з 40 іншых нямецкіх дакументаў, датаваных 1941 годам» [5, с. 22–23].

Гістарычныя крыніцы, у тым ліку і нямецкага паходжання, даюць права доказна сцярджаць толькі аб тым: арганізаваная абарона Брэсцкай крэпасці працягвалася да 30 чэрвеня, асобныя ачагі супраціўлення існавалі да 23 ліпеня 1941 г., а колькасць абаронцаў на момант пачатку штурму значна пераўзыходзіла замацаваную ў айчыннай гістарыяграфію лічбу 3,5–4 тыс. чалавек. У сваю чаргу, дадзеная лічба – гэта колькасць салдат і афіцэраў, якія змагаліся з ворагам пасля выхаду з крэпасці значнай часткі асноўных сіл. Пытанні аб колькасці абаронцаў, якія здолелі пакінуць крэпасць у пачатку штурму, загінуўшых і трапіўшых у палон чырвонаармейцаў і членаў іх сямей застаюцца адкрытымі і патрабуюць далейшага вывучэння.

**Заключэнне**

Дакументальныя зборнікі, якія з’явіліся ў 2010–2016 гг., у пераважнай большасці мелі тэматычны характар. Адной з асаблівасцей была падрыхтоўка дакументальных зборнікаў сумеснымі намаганнямі даследчыкаў розных краін. Практычна ўсе яны ўключаюць гістарычную і археаграфічныя часткі. Абавязковымі сталі пералік выкарыстаных крыніц, геаграфічны, прадметна-тэматычны, імянны паказальнікі, спіс скарочаных найменняў. Выданні адрозніваюцца шырокім выкарыстаннем новых дакументаў, у тым ліку з замежных архіваў. Агульная колькасць выданняў сведчыць аб павышэнні ўзроўню археаграфічнай працы ў архіўных установах. У цэлым паспяхова былі вырашаны пытанні перадачы тэксту і археаграфічнага афармлення дакументаў.

Уведзеныя ў навуковы ўжытак новыя дакументальныя факты і архіўныя крыніцы дазваляюць унесці пэўныя ўдакладненні ў храналогію абароны Брэсцкай крэпасці, пацвярджаюць выснову савецкай гістарыяграфіі пра тое, што штурм стаў першым шокам для нямецкіх салдат і бессмяротным подзвігам пагранічнікаў і чырвонаармейцаў, а з другога боку, паказваюць трагедыю палонных чырвонаармейцаў. Прыведзеныя ў зборніках факты даюць магчымасць аднавіць карціну баёў на Віцебшчыне ў пачатку Вялікай Айчыннай вайны, па-новаму паказаць дзеянні савецкіх войскаў Цэнтральнага фронту на гомельскім напрамку, удакладніць храналагічныя рамкі зафіксаванай у нямецкіх дакументах «Магілёўскай бітвы». Страты, панесеныя вермахтам у жывой сіле і тэхніцы з 22 чэрвеня па канец ліпеня 1941 г., заклалі падмурак да зрыву ў далейшым плана «маланкавай вайны». Пацвярджэннем таму служыць дырэктыва № 34 «Аб далейшым вядзенні вайны на ўсходзе» ад 30 ліпеня 1941 г., у якой «А. Гітлер упершыню пасля нападу на Савецкі Саюз аддаў камандаванню групы армій “Цэнтр” загад аб пераходзе да абароны на маскоўскім напрамку наступлення». Дакументы дапоўнены

ўспамінамі і сведчаннямі, што дазволіла паказаць не толькі трагедыю вайны, але і асаблівасці развіцця ваенна-палітычных падзей 1941 г. з найбольшай дакладнасцю.

Разам з тым гісторыкі яшчэ не выкарысталі ўсяго комплексу дакументаў па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Увядзенне ў навуковы ўжытак гэтага матэрыялу дазволіць больш поўна і ўсебакова асвятліць летнія падзеі 1941 г. на тэрыторыі Беларусі.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ


1. Беларусь. 1941–1945: Подвиг. Трагедия. Память : в 2 кн. / НАН Беларуси, Ин-т истории ; редкол.: А. А. Коваленя (пред.) [и др.]. – Минск : Беларус. навука, 2010. – Кн. 2. – 358 с.
2. Ганцэр, К Спекуляцыі замест сур'ёнага даследавання / К. Ганцэр // Arche-Пачатак. – 2011. – № 11. – С. 162–172.
3. Новікаў, С. Я. Новыя факты і ацэнкі па гісторыі Брэста і Брэсцкай крэпасці летам 1941 года / С. Я. Новікаў // Беларус. гіст. часопіс. – 2016. – № 5. – С. 38–47.
4. Здановіч, У. В. Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны. Агляд крыніц і айчыннай гістарыяграфіі : манаграфія / У. В. Здановіч ; навук. рэд. А. А. Каваленя. – Брэст : БрДУ, 2012. – 283 с.
5. Брест: Лето 1941 г. Документы. Материалы. Фотографии / авт.-сост. К. Ганцер (рук. группы) [и др.]. – Смоленск : Инбелькульт, 2016. – 723 с.
6. Алиев, Р. Брестская крепость. Воспоминания и документы / Р. Алиев. – М. : Вече, 2010. – 488 с.
7. Новікаў, С. Я. Беларусь улетку 1941 года: новыя падыходы ў даследаванні баявых дзеянняў / С. Я. Новікаў. – Мінск : МДЛУ, 2014. – 300 с.
8. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Брэста : у 2 кн. / рэдкал.: Р. Р. Бысюк [і інш.]. – Мінск : БЕЛТА, 1997. – Кн. 1. – 576 с.
9. Новікаў, С. Я. Брэсцкая крэпасць у дакументах і ўспамінах / С. Я. Новікаў // Беларус. гіст. часопіс. – 2011. – № 6. – С. 27–33.
10. Новікаў, С. Я. Беларусь улетку 1941 года: новыя падыходы ў даследаванні баявых дзеянняў / С. Я. Новікаў. – 2-е выд., выпр. і дап. – Смаленск : Універсум, 2015. – 436 с.
11. 1941 год: Страна в огне : в 2 кн. / Рос. акад. наук, Ин-т всеобщ. истории ; редкол.: А. А. Коваленя, В. А. Смолий, А. О. Чубарьян. – М. : ОЛМА Медиа Групп, 2011. – Кн. 2 : Документы и материалы. – 720 с.
12. Павлов, Я. С. В суровом сорок первом / Я. С. Павлов. – Минск : Беларусь, 1985. – 272 с.
13. Борисенко, Н. С. Днепровский рубеж: трагическое лето 1941-го : защитникам г. Могилёва посвящается / Н. С. Борисенко. – Могилёв : Могилёв. обл. укрупн. тип., 2005. – 366 с.


Рукапіс паступіў у рэдакцыю 30.01.2017

***Zdanovich V.V.*** **The Fighting on the Territory of Belarus in the Summer of 1941: the Lighting of the Problems in the Documentary Collections (2010–2016)**

*Published in 2010–2016 documentary collections dealing with the fighting on the territory of Belarus in the summer of 1941 are analyzed. It is noted that the compilers of collections carried out considerable work on search and preparation for printing various sources found mostly in foreign archives. Documentary collections, which appeared in the mentioned period, had mostly a thematic character. One of the features of this period was the preparation of documentary collections with the joint efforts of Belarusian and foreign historians. In general, it successfully settled the issues of text transmission and of the archaeological documentation. A significant addition to the content of the published documents is a scientific-reference apparatus. However, this problem cannot be finally solved without updating source base on the history of the last war, introducing into the scientific circulation of the entire set of documents.*